4. Нестерова, И. А. Нетрадиционные формы урока. Образовательная энциклопедия [Электронный ресурс] / И. А. Нестерова. – Режим доступа: http://odiplom.ru/lab/netradicionnye-formy-uroka.html. – Дата доступа: 10.11.2018.

---

# АБ ДЭФІНІЦЫІ ПАНЯЦЦЯ «МОЎНАЯ КАМПЕТЭНЦЫЯ»

*Квецень Д.В.,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск*

Анатацыя. Сёння беларуская адукацыя перажывае этап мадэрнізацыі, які характарызуецца пераходам ад традыцыйнай мадэлі навучання да кампетэнтнаснай. У артыкуле разглядаецца праблема дэфініцыі паняцця моўнай кампетэнцыі, яе сутнасці, размежавання паняццяў «кампетэнцыя» і »кампетэнтнасць». Актуальнасць дадзенай тэмы ў тым, што вывучэнне моўнай кампетэнцыі знаходзіцца на стадыі асэнсавання, абагульнення і не знайшло яшчэ лагічнага завяршэння.

*Ключавыя словы: кампетэнтнасны падыход, сродак камунікацыі, кампетэнцыя, кампетэнтнасць, моўная кампетэнцыя, моўная сістэма, граматычная мадэль.*

Сёння беларуская адукацыя перажывае этап мадэрнізацыі, які характарызуецца пераходам ад традыцыйнай мадэлі навучання да кампетэнтнаснай. Кампетэнтнасны падыход праяўляецца і ў абнаўленні зместу моўнай адукацыі. Калі раней асноўнай мэтай адукацыйнага працэсу было моцнае і трывалае засваенне навучэнцамі пэўных ведаў, то цяпер значнае месца займае сумесная дзейнасць педагога і навучэнца па набыцці ведаў, уменняў і навыкаў як сродку камунікацыі. Пры рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу робіцца акцэнт на развіваючыя тэхналогіі, праблемна-модульныя сістэмы навучання, праектна-даследчыя метады, рэйтынгавыя сістэмы ацэнкі вучэбных дасягненняў, актывізацыю вучэбна-пазнавальнай і самастойнай дзейнасці навучэнцаў [1, с. 546].

Рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу мае на ўвазе фарміраванне ў навучэнцаў кампетэнтнасці і шэрагу кампетэнцый. У літаратуры адсутнічае адзіны пункт гледжання на змест гэтых асноўных паняццяў, якія цесна ўзаемазвязаныя. У цяперашні час паняцце «кампетэнтнасць» пашырана, у яго ўключаны асобасныя здольнасці чалавека, заснаваныя на ведах, уменнях і вопыце ў пэўнай сферы. Вывучаючы праблему кампетэнтнаснага падыходу ў адукацыі, айчынная даследчыца А.Л. Жук падкрэслівае, што кампетэнтнасць – «якасць чалавека, які валодае ўсебаковымі ведамі, вопытам практычнай дзейнасці ў якой-небудзь галіне, меркаванне якога з’яўляецца аўтарытэтным [1, с. 547]. Кампетэнтнасць – гэта валоданне чалавекам адпаведнай кампетэнцыяй, яна ўключае абагульненыя веды і ўменні, на аснове якіх праяўляюцца і фарміруюцца ў працэсе дзейнасці здольнасці і асобасныя якасці чалавека.

Абагульнены характар ведаў і ўменняў, якія ляжаць у аснове кампетэнцыі, вызначаюць іх сутнасць і магчымасць выкарыстання для рашэння шырокага кола праблем і задач. Кампетэнцыі з’яўляюцца структурнымі кампанентамі кампетэнтнасці.

Тэарэтычныя асновы фарміравання ў вучняў моўнай кампетэнцыі прадстаўлены ў працах многіх навукоўцаў-лінгвістаў. Аднак адзінага меркавання аб тым, што варта разумець пад моўнай кампетэнцыяй, у айчыннай і замежнай навуцы не назіраецца. Тэрмін «моўная кампетэнцыя» (ад англ. *linguistic*) упершыню быў уведзены амерыканскім лінгвістам Н.Хомскім у сярэдзіне XX ст. Моўная кампетэнцыя паводле М. Хомскага з’яўляецца ідэальным граматычным веданнем, заўсёды суадносным з веданнем моўнай сістэмы. У канцэпцыі М.Хомскага тэорыя і практыка раздзельныя. Даследчык сцвярджае што дзіця не можа быць навучаны ўмоўным правілам граматыкі, бо існуе прыроджанае ўяўленне пра ўніверсальныя граматычныя прынцыпы, якія і абумоўліваюць неўсвядомлены выбар дзіця патрэбнага правіла або набору граматычных правілаў [4].

У замежных даследаваннях, якія праводзіліся паслядоўнікамі Н.Хомскага ў канцы 60-х – пачатку 70-х гг., паняцце моўнай кампетэнцыі не атрымала кардынальна новага змястоўнага напаўнення. У большасці даследчыкі разумелі пад дадзеным тэрмінам «моўную здольнасць» і «моўную актыўнасць». Французская даследчыца С. Муаран лічыла, што моўная кампетэнцыя – гэта веданне фанетычных, лексічных і граматычных мадэляў моўнай сістэмы, уменне карыстацца імі ў сваім маўленні. Галандскі навуковец Ян Ван Эк разглядаў моўную кампетэнцыю як здольнасць ствараць і інтэрпрэціраваць граматычна правільныя выказванні, якія складаюцца са слоў, ужытых у сваім традыцыйным значэнні носьбітамі мовы. Даследчык прызнае, што моўная кампетэнцыя з’яўляецца асновай камунікатыўнай здольнасці для любога ўзроўню яе сфарміраванасці [2].

І.А. Зімняя вызначае кампетэнцыю як унутраныя, патэнцыяльныя веды, уяўленні, сістэмы каштоўнасцей і адносін, якія затым выяўляюцца ў кампетэнцыях чалавека. А. В. Хутарскі разумее пад кампетэнцыяй сукупнасць узаемазвязаных якасцей асобы ў адносінах да пэўнага кола прадметаў і працэсаў [3].

Паводле айчыннай даследчыцы П.К. Бабінскай, кампетэнцыя – гэта прадметная галіна, у якой асоба добра асвядомлена і праяўляе гатоўнасць да выканання дзеянняў; гэта веды, уменні, вопыт, неабходныя для рашэння тэарэтычных і практычных задач у пэўнай сферы моўных зносін [1, с. 570].

У сучаснай дыдактыцы і методыцы тэрмін «моўная кампетэнцыя» шырока выкарыстоўваецца ў якасці паказчыка ўзроўню валодання мовай, як

правіла, абазначае сукупнасць канкрэтных навыкаў і ўменняў. Прычым у розных працах даюцца розныя пералікі гэтых навыкаў і ўменняў.

У «Беларускай педагагічнай энцыклапедыі» моўная кампетэнцыя або лінгвістычная кампетэнцыя адзначана як веды пра сістэму мовы і розныя спосабы выказвання думкі, уменні выкарыстоўваць гэтыя веды ў працэсе зносін. Да моўнай кампетэнцыі адносяцца навыкі выбару моўных сродкаў у адпаведнасці з сітуацыяй зносін; канструяванне лексічных адзінак і граматычных форм і канструкцый; камбінаванне моўных сродкаў у сінтагмах і сказах. Навучэнец валодае моўнай кампетэнцыяй, калі ён мае ўяўленне пра сістэму мовы і можа карыстацца гэтай сістэмай на практыцы. На якасць моўнай кампетэнцыі ўплывае не толькі ступень авалодання гэтай мовай, але і ўзровень кампетэнцыі навучэнца ў роднай мове [1, с. 570].

Такім чынам, сутнасць моўнай кампетэнцыі і кампетэнтнасці, тэарэтычныя асновы і ўмовы іх фарміравання асветлены ў працах замежных і айчынных вучоных. Аднак названыя працы не закранаюць шляхоў фарміравання моўнай кампетэнцыі і кампетэнтнасці малодшых школьнікаў. Аналіз розных падыходаў да распрацоўкі гэтых паняццяў паказаў, што праблемы зместу моўнай кампетэнцыі і кампетэнтнасці, іх развіцця і вымярэння ў многіх аспектах застаюцца на сённяшні час у дыдыктыцы і методыцы нявырашанымі. Рашэнне гэтых задач дасць магчымасць вызначыць змест моўнай кампетэнцыі, этапы яе фарміравання, дазволіць падабраць эфектыўныя метады і кантрольна-вымяральныя эксперыментальныя сродкі ўзроўню сфарміраванасці моўнай кампетэнцыі навучэнцаў на розных ступенях навучання.

**Спіс літаратуры**


1. Белорусская педагогическая энциклопедия : в двух томах. Том 1. А–М / редкол. Н. П. Баранова [и др.]; науч. ред.: С. П. Самуэль, З. И. Малейко, А. П. Чернякова. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2015. – 735 с.
2. Божович, Е. Д. Языковая компетенция как критерий готовности к школьному обучению (на материале родного языка) / Е. Д. Божович, Е. И.Козицкая // Психологическая наука и образование. – 1999.– № 1. – С. 25–37.
3. Низаева, Л. Ф. Коммуникативная компетенция: сущность и компонентный состав [Электронный ресурс] / Л. Ф. Низаева // Молодой ученый. – № 28. – 2016. – Рэжым доступу: https://moluch.ru/archive/132/37125/. – Дата доступу: 25.11.2018.
4. Хомский, Н. Язык и проблемы знания / Н. Хомский // Вестник МГУ. Филология. –1995. – №14. – С. 130–157.